©Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа

***Зяткіна Н. М.**, настаўнік беларускай мовы і літаратуры сярэдняй школы № 19 г. Магілёва імя М. Ф. Сафонава*

## «Багата, родная ты мова!»
## Інформ-дайджэст для вучняў пачатковых класаў

Сучасным і эфектыўным метадам навучання становіцца метад «Роўны вучыць роўнага». Прапануем вашай увазе сцэнарый інформ-дайджэсту, які ў Міжнародны дзень роднай мовы для вучняў пачатковых класаў праводзяць вучні 5–6 класаў. Прапанаваны метад актывізуе пазнавальную дзейнасць не толькі малодшых школьнікаў, але і вучняў сярэдняга звяна. Такая форма пазакласнай работы садзейнічае развіццю творчых, камунікатыўных і лідарскіх здольнасцей вучняў, а таксама дапамагае выхаванню грамадзянскасці і пачуцця любві і павагі да роднай мовы.

**1-ы вучань:** Многа моў на гэтым свеце,
Многа слоў у іх букеце.
Многа думак, многа згадак,
Многа гукаў і загадак.
Але ёсць адна такая:
Словы ў ёй нібы звіняць,
Трэлі-гукі разліваюць
І ляцяць, ляцяць, ляцяць.

**2-і вучань:** Добры дзень, дарагія сябры! Сёння 21 лютага. У гэты дзень ва ўсім свеце адзначаецца Дзень роднай мовы. Мы, вучні 5 «А» класа, прыйшлі да вас у госці, каб расказаць, якая цудоўная і прыгожая наша родная мова.

**3-і вучань:** Адкажыце, калі ласка, на некалькі пытанняў:

1. Ці ведаеце вы, у якой краіне мы жывём? *(У Беларусі.)*
2. Ці ведаеце вы, якая сталіца нашай радзімы? *(Горад Мінск.)*

3. Ці ведаеце вы, як называецца народ, які жыве на беларускай зямлі? *(Беларусы.)*

4. Ці ведаеце вы, якая мова для беларусаў з’яўляецца роднай? *(Беларуская.)*

**4-ы вучань:** Беларусы — ветлівыя і добразычлівыя людзі. Таму ў нашай мове многа ветлівых слоў, якія дапамагаюць нам наладжваць сяброўскія адносіны, з’яўляюцца ключамі да сэрцаў людзей.

Сэрцы, нібы дзверы,

Можна адмыкаць,

Толькі трэба ведаць,

Дзе ключы шукаць.

«Калі ласка», «Дзякуй» —

Вось яны, ключы!

Ты іх, калі ласка,

Добра завучы. *(А. Стодарт)*

**5-ы вучань:** А якія ветлівыя словы вы ведаеце? (Адказы вучняў.)

**2-і вучань:** Малайцы! А зараз з вашай дапамогай мы раскажам верш пра ветлівыя словы:

Добра, калі ты змалку

Можаш вітаць людзей:

Раніцай: *(Добрага ранку!)*

І апаўдня: *(Добры дзень!)*

Увечары пры сустрэчы

Знаёмым сказаць: *(Добры вечар!)*

А соннаму сонейку нанач

І ўсім добрым людзям:. *(Дабранач!)* *(В. Вітка)*

**5-ы вучань:** Сябры, а ці ўмееце вы адгадваць загадкі? Толькі адказвайце, калі ласка, па-беларуску:

1. Белы, як снег, салодкі, як мёд. *(Цукар.)*

2. Сядзіць пані ў чырвоным жупане, хто жупан здзірае, той слёзы праліваецца. *(Цыбуля.)*

3. Невялікі, рыжаваты, а хвост доўгі і калматы, на дрэве жыве і шышкі грызе. *(Вавёрка.)*

4. Не кравец, а ўсё жыццё з іголкамі ходзіць. *(Вожык.)*

**1-ы вучань:** Вось і заканчваецца наша сустрэча.

**2-і вучань:** Нам прыемна было з вамі размаўляць.

**3-і вучань:** Дзякуй вам за ўвагу!

**4-ы вучань**: Мы жадаем вам добра вучыцца і любіць беларускую мову!

**5-ы вучань:** Размаўляйце па-беларуску. Размаўляйце з прыветнай усмешкай, з пяшчотай на вуснах — і нашай мовай захочуць гаварыць і іншыя. Да новых сустрэч!